# КАБ ЖЫЦЬ...



12+

Дзмітрый Акуліч

Дмитрий  Акулич

# Каб жыць…

«ЛитРес: Самиздат»

2020

**Акулич Д. М.**

Каб жыць…  /  Д. М. Акулич —  «ЛитРес: Самиздат»,  2020

Аповесць пра сям'ю, якая сустрэла вайну і рабіла ўсё для таго, каб жыць. У аснову аповесці ляглі ўспаміны рэальнага чалавека.

© Акулич Д. М., 2020
© ЛитРес: Самиздат, 2020

# Дмитрий Акулич
# Каб жыць…

Аповесць

У аснову аповесці ляглі ўспаміны
Лешанок Вольгі Васільеўны.

2020

Сям'я Лешанок, не так даўно перабралася з хутара Круглае ў вёску Пратасы. Светлавалосая жанчына, Паліна, з блакітнымі вачыма і з мяккім характарам, ростам ніжэй свайго мужа, маці чацвярых дзяцей. Яе муж, Васіль: чалавек шчыльнага целаскладу, працавіты, каравокі з чорнымі густымі бровамі, выцягнутым авалам твару. Іх старэйшая дачка Надзя, стройная, светлая дзяўчына, з блакітнымі вачыма і тонкімі вуснамі. Сярэдняя ж дачка Іра, выглядала інакш: шэра-карыя вялікія вочы, з выразным сумным аблiччам, высокі лоб, востры нос, сваімі рысамі больш была падобная на бацьку. Малодшая, трохгадовая дачка Воля, маленькая дзяўчынка з пульхнымі шчокамі, па знешнасці яна вельмі падобная на сваю старэйшую сястру Надзю, дапытлівая. Адзіны сын Сцяпан, якому некалі было гуляць з сёстрамі, так як ён заўсёды займаўся з татам сумеснымі справамі. Сыходзіў і прыходзіў дадому разам з бацькам.

Ведаючы амаль усіх жыхароў і мясцовасць, раней жывучы ад іх на адлегласці трох кіламэтраў, сям'і было нецяжка прыжыцца, асвоіцца на новым месцы. Яны не хацелі пераязджаць, але ў гэты час, з хутароў многіх забіралі працаваць у калгасы. Год жыцця на новым месцы быў нецяжкі. Яны не забывалі мінулы дом і часта вярталіся на хутар. Сумавалі па роднай зямлі, па тых мясьцінах, дзе ўсё пачыналася.

У першы месяц лета, надвор'е выдалася разнастайным. Не было доўгай сухасці і штодзённых мокрых вуліц.

Гэтай ноччу, пасля спякотнага дню, прайшоў дождж. Ды такі, што многім здавалася, што халоднай вадой залье ўсе вуліцы і вада кране ўваходныя дзверы дамоў. Страшэнны гром хістаў зямлю. Але ён знік, спыніўшыся за пару гадзін да світання, да таго як стала святлець і пачалі спяваць пеўні. Зямля хутка ўвабрала дажджавую ваду, лужыны сталі меншыцца…сонца падымалася з-за гарызонту, і ўсё больш, і больш краналася сваімі прамянямі вёску. Кроплі бліскалі і выпараючыся падымаліся да неба.

Сёння ўся сям'я была запрошаная на вяселле суседскага сына. Паліна і Васіль пасля хатніх ранішніх спраў, прыйшлі да суседзяў, каб дапамагчы ім з вяселлем, разам, з ужо прыйшоўшымі да іх раней сваякамі. Усе былі занятыя падрыхтоўкай розных пачастункаў, печ ні на хвіліну не астывала. На сталы ставілі гатовыя пачастункі. Дзеткі бегаюць і смяюцца каля дваровых будынкаў. Разам з імі, з рабятнёю, гэтак жа гуляюць і іх тры сімпатычныя дачкі. Надзя ў бела-сіняй сукенцы, ззаду дзве тоўстыя касы. Сярэдняя апранутая ў бардовы сарафан, яе распушчаныя светла-русыя косы клаліся паверх яго. Маленькая чароўная Вольга, са светлымі валасамі да плячэй, у сіняй сукенцы, якая падкрэслівае колер яе вачэй. Воля ледзь паспявае за сваімі старэйшымі сёстрамі, бегае за імі ў след.

Да абеду, з вуліцы ў двор пачалі падыходзіць людзі, у доме ўжо было поўна народа. Гучна граў гармонік, у вясёлых воклічах, былі чутныя гукі тупання ног. Жаніх і нявеста ветліва ўсміхаліся гасцям. Старэйшыя людзі спявалі песні, маладыя танцавалі ў парах.

І раптам, з далёк, пачаўся даносіцца грозны, дрыготкі гул. Які станавіўся ўсё гучней, і гучней, і заглушаў вясельныя песні. Весялосьць паступова згасала, шум адцягваў і цікавіў шматлікіх. Людзі сталі выходзіць на вуліцу, палахліва ўзіраючыся ў бок гудзення, прадзіраю-

чыся наперад. Над лесам, над вяршынямі хвояў, вылятаў жалезны рой. Першымі, выпрабавалі вялікі страх дзеткі, якія не разумелі, што адбываецца. Астатнія ж з здзіўленнем глядзелі, з пачашчаным дыханнем яшчэ часцей удыхалі свежае паветра. Гул ударыў па вушах, быццам прайшоў па ўсім целе. Дзеці расплакаліся і прыціснуліся да бацькоў. А тыя, падняўшы галаву ўверх, не заўважаючы крык дзяцей, углядаючыся ў лятучы нябёсны транспарт.

Самалёты набліжаліся, праляталі над галовамі. Станавілася яшчэ цяжэй на душы ў жыхароў вёскі, мурашкі прабягалі па іх целе…

– Гэта ўварванне, таварышы! Вайна! – хтосьці з натоўпу ўсклікнуў спалоханым голасам.

– Ну што ж вы…не! Гэта ж нашы! Вучэнні, нябось, якія… – супакойваў сябе і іншых хлапчук. Быццам не надаваў гэтаму значэння.

Вялікі цень самалётаў хаваў вёску ад сонца. Прамяні з цяжкасцю прабіваліся і тычыліся людзей.

– Як гэта нашы?? На іх жа крыжы! Гляньце! На крылах! Знакі та не нашы! – праз вялікі шум машын паспрабаваў гучна выклікнуць сівы старык…выцягнуўшы руку ўверх паказваючы пальцам на імклівыя шэра-белыя знакі.

Германскія самалёты ляцелі суцэльнаю лавою, так, што не было відаць і кавалачка блакітнага неба. Чорныя і лютыя птушкі з крыжамі. Здавалася, быццам і няма ім канца.

Пасля, сыходзячых, праляцеўшых варожых самалётаў, у небе зноў з'явіліся аблокі. Стаяла нязвыклая цішыня. Людзі сталі патроху прыходзіць у сябе, заводзіць размовы. Па вуліцы, звяртаючы на сябе ўвагу, ехаў на ровары пятнаццацігадовы хлопчык. Ён вельмі гучна крычаў і паўтараў.

– Па радыё перадаюць! Вайна! Вайна! Аб'ява вайны!

Паліна забрала дзяцей да хаты. Муж застаўся з іншымі абмяркоўваць убачанае. Усе дарослыя сабраліся каля сельсавету, бо толькі там можна было пачуць паведамленне, каб цалкам у гэта паверыць і яшчэ больш адчуць гучнае біццё сэрца. Народ сабраўся.

– Дысцыпліна! – супакоіў кіраўнік калгаса, папрасіў увагі.

Усе чакалі што ж будзе далей.

Адразу ж, па радыё данёсься грубы мужчынскі голас. Які, раз-пораз паўтараў, што пачалася вайна. Германскія войскі перайшлі мяжу.

Разгубленыя, рассеяныя, напалоханыя жыхары не разумелі, што рабіць далей. Хто хацеў застацца ў вёсцы, хто рыхтаваўся бегчы, хавацца ў лесе. Раптоўна чуваць шмат галасоў. Радыё працягвала даносіць новыя весткі.

Людзі разбегліся па сваіх хатах.

Пра вяселле больш не ўспаміналі.

***

Лешанок Васіль разумеў, што вайна хутка не скончыцца, па радыё паведамлялі – Кіеў палае ў агні варожых бомбаў. Ён ішоў па вуліцы, ступнямі прымінаючы невялікую зялёную траву. Шырока крочачы, ступаў на трохі высахлы пясок, пераходзячы вуліцы, спяшаўся дадому.

Бацька сямейства спыніўся каля хаты. Зняў шапку, выцер пот з твару і лысіну. Узяў папяроску і пачаў некалькі хвілін прыслухоўвацца да цішыні. Васіль баяўся зноў пачуць, той страшэнны гул самалётаў, які не выйшаў з яго памяці. Вецер з лесу толькі даносіў спевы птушак. Потым, Васіль зайшоў у свой двор і абдумаў дзеянне ў сваёй галаве: “ – У вёсцы заставацца небяспечна, вось-вось могуць прыйсці сюды немцы.”

Зайшоў у дом. Твар яго задуменны, строгі. Бровы пацяжэлі і апусціліся. Ён не казаў лішніх слоў і таму адразу раздаў абавязкі.

– Будзем сыходзіць з вёскі! – упэўнена сказаў муж жонцы, загадаўшы збіраць рэчы.

У яго голасе была цвёрдасць, рашучасць, якая давала надзею на лепшы зыход.

Васіль узяў з сабою Сцяпана і выйшаў на двор. Яны разам узялі з хляву дзве рыдлёўкі і пайшлі ў лес капаць яму. Капаць глебу было лёгка, зямля мяккая. Але Сцяпан хутка пачаў стамляцца, зняў з потнай галавы шапку, расшпіліў кашулю. Да ночы, яны правялі ў лесе. Нараніцу ж, секлі дрэвы і клалі бярвенні да сценак. Будавалі дах зямлянкі, рыхтуючыся пакінуць сваю хату.

Пасля завяршэння будаўніцтва, да вечара, Паліна выносіла ў лес, з хаты, самыя патрэбныя рэчы. З-за страху і летаніны, у доме стаяў поўны хаос. У гатовую зямлянку, разам з сёстрамі, сярэдняя дачка Іра прыносіла: ваду, ежу, вопратку. Таксама, бралі з сабой сала, бліны і хлеб. Малодшая старалася дапамагчы сям'і і не блыталася пад нагамі. Слухалася, выконвала ўсё тое, што ёй казала сястра Надзя.

Зямлянка гатовая, але яны ўсе яшчэ заставаліся ў хаце. Старая веснічка зарыпела. Адкрылася і зачынілася. Да вакна падбегла Воля, залезла на лаўку, якая стаяла каля вакна. Але, нікога не было. Веснічка стаяла нерухома. Толькі рыжая кура дзяўбала траву, падняла галаву, зірнула на дзіця. Вольга хутка злезла, яе заўважылі.

Дзверы ў хаце адчыніліся. У госці зайшоў малодшы брат Васіля, Навум.

– У вас усё гатова? – спытаў глухім голасам Навум.

– Усё, акрамя вала. Не хачу яго пакідаць. – вымавіў Васіль з невясёлай усмешкай.

Яны выйшлі на двор. У хляве стаяў у меру ўкормлены малады вол.

– Добрае мяса, лепш хай мы яго з'ядзім, чым ён дастанецца ворагам. – сказаў свайму брату старэйшы брат Васіль.

Навум моўчкі кіўнуў. Разумеў, што трэба яшчэ застацца ў вёсцы і дапамагчы брату. На наступны дзень, ранняй раніцай, Вася з братам Навумам, вывелі вала з пабудовы. Чарнавокая жывёліна супрацівілася, быццам ведала, што здарыцца. Час прымушаў, падганяў, шаптаў спыніць сэрца жывёлы. Жалезнае, доўгае шыла ўваткнулася ў цела. Вол пастаяўшы хвіліну, зваліўся на траву.

Мяса браты падзялілі і пасля схавалі яго далей, каля былой хаты, на хутары. Заклалі мяса ў бочкі і закапалі ў невялікія ямы. Астатнюю частку, пазацягвалі высока на елкі, абматаўшы туга тканінамі.

Спяшаючыся, калі сыходзілі з хаты ў зямлянку, пра курэй забыліся зусім.

***

Ужо на трэці дзень, да вечара, у вёсцы пачуўся гук матацыклаў. Узброеныя салдаты едуць па галоўнай вуліцы. Пару салдат заходзілі ў хаты, адзін за адным аглядалі іх, выганяючы адтуль людзей. Шматлікія сем'і пакідалі хаты і ўцякалі ў лес, хаваліся… Іншыя ж, заставаліся сустракаць гасцей. Хаты гарэлі. Кулі свішчалі над галовамі спяшаючых.

– Заб'юць вас усіх! Хавайцеся! – разносіліся словы з вуліц.

Са сваёй хаты выйшла і пабегла старушка, адной рукой падхапіўшы край свайго фартуха, бегла па агародзе ў лес. З малітвай на вуснах старая падае каля першай хвойкі. Куля прайшла скрозь яе цела.

– О-о-о-ой. – застагнала яна, ад пранізлівага болю, вырваўся перадсмяротны стогн.

Густая трава хавала яе цела, якое паступова астывала, пад бясхмарным небам.

На процілеглым канцы вёскі, станавілася ўсё больш пустуючых хацін. Неазіраючыся, жыхары беглі ў хвойны бор. Толькі адзін дзядок застаўся сядзець ля сваёй хаты, на лаўцы.

“Каго? Чаго? Мне баяцца?!” – падумаў і дастаў трубку з тытунём дзед Ян.

Уся сям'я Лешанок схавалася ў сваёй выкапанай зямлянцы.

Вёска стаіць у густым дыме, пакрылася чорным пылам. Людзі яшчэ бегаюць, мітусяцца, слёзы адчаю засцілалі ўсё перад сабой. На зямлі ляжалі некалькі забітых, над імі плакалі ста-

рыя. Стрэлы ўнеслі страх і парадак, спынялі хаос. Пачалі зганяць мірных жыхароў у адзін натоўп.

Як палоханы статак стаялі людзі ў асяроддзі салдат. З вялікім гонарам, нямецкі афіцэр гаварыў на сваёй роднай мове. Перакладчык гучна распавядае, аб чым даносіў ім немец. Пасля строгай прамовы, усіх замкнулі ў некалькіх хатах.

Вярталі назад, і тых, хто ўсё ж такі ўцёк, і дрэнна схаваўся. Невядомыя салдаты, добраахвотнікі на конях, зганялі назад у вёску людзей для агульнага парадку. Немцы баяліся фарміравання партызанскіх атрадаў, паўстанняў. Кожны ўпушчаны чалавек, гэта небяспека для іх.

У Пратасах усталявалася новая ўлада.

Сям'і Лешанок было жудасна, нязвыкла, праводзіць ноч у волкай, прахалоднай, замаскіраванай галінкамі елі, яме. Дзе была земляная падлога, сцены, закапаныя ў столь. Вольга з Ірай ад страху і неразумення, не раз задавалі пытанні матулі, на якія тая, траціла ўсё менш слоў. Усім было не па сабе.

На досвітку наступнага дня, над лесам праляталі самалёты. Раздаваліся стрэлы. Самалёты пускалі кулі ў густыя лясы, дзе відавочна былі свежыя выкапаныя зямлянкі. Стралялі і ў рухаючых, уцякаючых людзей.

– Іра, Надзя, прычыніце падушкамі дзверы! – строгім голасам прамаўляў бацька.

Сам жа ён, з жонкай Палінай і старэйшым сынам Сцяпанам, падносіў пярыны ўверх, каб кулі не прабілі дах іх прытулку. Стук ад куль. Маўчанне ў цемры. Дзяўчаты, зачыніўшы вочы, ляглі на глебу.

Страляніна скончылася. Праз гадзіну, Васіль выбраўся з зямлянкі на разведку. Нямецкіх салдат паблізу няма, няма не якіх мільгаючых чалавечых сілуэтаў.

Яшчэ да вечару, зноў над імі пралятаў самалёт. Сёння за дзень было два налёты.

Новы дзень уносіў яшчэ больш праблем. Нямецкія баявыя машыны, віселі і віселі ў небе. Масава, адну за другой, бамбілі зямлянкі. Стала яшчэ менш бяспечна заставацца ў волкім прытулаку. Сям'я, з шасці чалавек, сядзела і са страхам прыслухоўвалася да гулу паражальных выбухаў. Задрыжала зямля ад удараў, стаяў жудасны грукат. Некалькі снарадаў лягло прам перад імі.

Нарэшце, абстрэл спыніўся.

– Усе жывыя і здаровыя? – азіраючыся па баках, спытаў Васіль.

Паліна разгледзела дзяцей.

– Так, усе дзеці цэлыя. – уздыхнула з палягчэннем.

– Значыць так… – стаў тлумачыць новую задачу Васіль.

Каб схавацца ад нямецкіх салдат і самалётаў, ім давялося сыходзіць яшчэ далей, бліжэй да балотаў. Бегчы на хутар не мела сэнсу, немцы і туды дабяруцца.

Ісці, пераадольваючы гушчу, было цяжка. З усіх бакоў вёскі лагчыны і балотцы. Тут таксама гушча зараснікаў, лазы, вольхі. Якая, нібы ніткамі, спляталася і наглуха хавала невялікія гукі. Зялёная ціна ляжала на халоднай вадзе, гнутыя галіны мачыліся ў вадзе. Нярэдка можна ўбачыць праляталых птушак. За густымі галінамі хавалася невялікая травяністая глеба, якая грэлася сонцам.

Сям'і прыходзіцца жыць тут, у будане з адсечаных палак і галінак. На нізкіх суках віселі вялікія пакрывалы, у якія было загорнута адзенне, ежа і пару місак з лыжкамі. Адрытае непадалёк паглыбленне для вогнішча. Побач з якім, знаходзілася нарыхтаваная кучка галля.

***

Паступова, полымя на людскіх хатах стала згасаць, але вуголлі яшчэ доўга не згасалі.

Неадкладна ў вёсцы з'явілася ўнутраная паліцыя, добраахвотнікі з вёскі. З стрэльбай на плячы, у чорнай форме і белай павязкай на руцэ. Уступалі ў іх шэраг тых, хто хацеў захаваць

сабе жыццё і жыццё сваім блізкім. І тыя, хто верыў у новую ўладу. Паліцыя вызваляла свае сем'і ад загадаў новай улады і вывозіла іх з Пратасоў у іншыя бліжэйшыя пасёлкі, дзе было больш спакойна. Таксама сачыла за парадкам на вуліцах, забяспечвала харчаваннем нямецкія кухні ў дзень важных падзей.

Дзед Ян сядзеў, як статуя, усё на той жа сваёй лаўцы, каля хаты. Да яго падышлі два паліцэйскіх салдата.

– Так-так-так!.. Ну што, дзед? Пара табе сыходзіць з сваёй хаты. Будзеш жыць з усімі, у адной. – сказаў незадаволена, моршчачыся салдат.

– Што ты брэшаш, дурань?! Прэч пайшоў, не чапай мяне! – адказаў стары.

– Што-о?! – уклініўся ў размову іншы паліцэйскі. – Уставай дзед Ян, па-добраму просім.

– Чуеце, хлопцы, не чапайце мяне! Гэта мая хата!!! Што гэта вы выдумалі!?

– Так… Ну, а цяпер уставай!

Адважыліся, узяцца за дзеда… Цягнулі рукі, каб падняць яго. Старык Ян паваліўся на глебу з пустыннымі вачыма, памёр, з заціснутай у зубах трубкай для тытуню. У жаху, няхутка, салдаты пакінулі гэтае месца.

Некаторыя ж, жыхары, не заставаліся ў вёсцы і не ўступалі ў паліцыю, а далучаліся да атрадаў партызан, якія жывуць у лясах. Налётчыкі і бунтары, давалі адпор акупантам.

Брат Васіля, Навум, як і сам Васіль, не стаў выбіраць адзін з бакоў: падацца да партызанаў або служыць у паліцыі. У войска іх таксама не пабралі, ні якіх позваў не прыходзіла ў вёску. Можа з-за таго, што не паспелі ім адправіць ці проста своечасова не дайшлі да сваіх адрасатаў. Таму, яны бадзяюцца ў лясах, са сваімі сем'ямі.

# Конец ознакомительного фрагмента.

Текст предоставлен ООО «ЛитРес».

Прочитайте эту книгу целиком, купив полную легальную версию на ЛитРес.

Безопасно оплатить книгу можно банковской картой Visa, MasterCard, Maestro, со счета мобильного телефона, с платежного терминала, в салоне МТС или Связной, через PayPal, WebMoney, Яндекс.Деньги, QIWI Кошелек, бонусными картами или другим удобным Вам способом.